7. Путевые очерки, заметки и наброски. Поездка по России в 1890 году. Село Иваново / Русская старина. Т. 68. – СПб., 1890. – С. 719–730.
8. Сапунов, А. Памятники времен древних и новейших в Витебской губернии / А. Сапунов. – Витебск, типолитография Г. и П. Подземских, 1903.
9. Случевский, К. К. По северо-западу России. Т. 2 / К. К. Случевский. – СПб. : изд. А. Ф. Маркса, 1897. – 609 с.
10. Хмельницкая, Л. В. Витебские годы Александра Рома: председатель комиссии по охране памятников. / Л. В. Хмельницкая // Бюллетень Музея Марка Шагала. – Вып. 18. – Витебск: Витебская областная типография, 2010. – С. 36–57.
11. Хмяльніцкая, Л. Гісторык з Віцебска (жыццяпіс Аляксея Сапунова) / Л. Хмяльніцкая. – Мінск : Энцыклапедыкс, 2001. – 256 с.
12. Церковь Иоанна Предтечи [Электронный ресурс] // Памятники истории и культуры Псковской области. Энциклопедический справочник. – Режим доступа: http://www.opskove.ru/object/104380884?lc=ru. – Дата доступа: 07.02.2017 г.


**Мяньчэня С.В.**

## АГЛЯД ДРУКАВАНЫХ КРЫНІЦ ПА ГІСТОРЫІ БАРАЦЬБЫ ЗА ЦВЯРОЗАСЦЬ У БЕЛАРУСІ Ў ПАЧАТКУ ХХ СТАГОДДЗЯ

Праблема станаўлення цвярозага ладу жыцця як сёння, так і пачатку ХХ ст. з'яўлялася дастаткова актуальнай, а вывучэнне гістарычнага вопыта – гэта магчымасць пераняць лепшае і пазбегнуць памылак мінулага. Вялікую групу крыніц па гісторыі барацьбы за цвярозасць у гэты перыяд складаюць друкаваныя матэрыялы, якія ў адрозненні ад архіўных матэрыялаў з'яўляюцца масавымі і больш даступнымі. Сярод іх можна вылучыць наступныя групы: 1) антыалкагольныя выданні; 2) перыядычныя выданні; 3) матэрыялы справаздач.

Антыалкагольныя выданні характарызуюцца вялікай разнастайнасцю – гэта і выданні таварыстваў цвярозасці, і антыалкагольныя падручнікі, і навуковыя агляды, і працы асобных аўтараў. У сувязі з вялікай колькасцю крыніц, а таксама па прычыне таго, што іншыя катэгорыі ўжо разглядаліся аўтарам [6], спынімся на апошняй групе.

Адзін з ідэолагаў цвярозага руху Міхаіл Чэлышаў, па ініцыятыве якога была створана Камісія аб мерах барацьбы з п'янствам у ІІІ Дзяржаўнай Думе, заставіў пасля сабе значную колькасць выданняў. Сярод іх можна вылучыць "Речи М.Д. Челышева, произнесённые в Третей Государственной Думе о необходимости борьбы с пьянством и по другим вопросам" (Пецярбург, 1912 г.) [11]. Тут акрамя прамоў Чэлышава падаецца інфармацыя аб дэпутатах падтрымаўшых іх, сярод якіх можна знайсці і прадстаўнікоў беларускіх губерній. Так, за праэкт ад 4 красавіка 1908 г. аб ліквідацыі кропак продажу моцных напояў ў сельскай мясцовасці выказалася 193 дэпутата, у тым ліку 19 з 36 прадстаўнікоў беларускіх губерній. Падтрымалі заяву сялянскія дэпутаты Цыунеліс, Амасёнак, Ермалаеў, Вайцюлік, Ермольчык, Кучынскі, Юркевіч; прадстаўнікі духавенства епіскап Мітрафан, Мацеевіч, Вераксін, Ніканович, Кузмінскі, Салаўевіч і інш [11, с. 70–73].

Аўтарытэтнай асобай у антыалкагольным руху пачатку ХХ ст. быў епіскап Мітрафан Гомельскі (з 1912 – Мінскі і Тураўскі), менавіта ён з'яўляўся старшынёй "чэлышаўскай" камісіі ў Дзяржаўнай думе. Як і Чэлышаў Мітрафан быў прыхільнікам абсасютнага устрымання ад алкаголя і лічыў, што барацьба з п'янствам гэта справа кожнага чалавека, бо толькі угульнымі намаганнямі дзяржавы, царквы і грамадства можна дасягнуць поспеху : "Як ворага на вайне агульнымі сіламі адціскаюць, ахопліваюць і знішчаюць, так трэба рабіць і ў дачыненні да алкаголю" [4, с. 29]. У 1912 г. у Мінску выйшла з друку яго прамова "Беседа о вреде алкоголя и средствах борьбы с ним" [4], а праз год зборнік "В борьбе за трезвость" [5] куды ўвайшлі тэксты выступленняў у Думе, а таксама распрацаваны камісіяй законапраэкт па барацьбе з п'янствам. Пры садзейнічанні Мітрафана з'яўляліся і іншыя выданні. Так, у 1914 г. быў выдадзены ліст агранома Бруноўскага да епіскапа па пытанню арганізацыі агранамічных курсаў і чытанняў сярод сялян для супрацьдзеяння галечы і п'янству [5].

Адным з першых беларускамоўных антыалкагольных выданняў можна лічыць "Слова аб праклятай гарэлцы…" [1], якое выйшла ў Пецярбурзе у 1900 г. Аўтар выдання пазначаны як сябра папячыцельства аб народнай цвярозасці А.І., лічыцца, што гэта краязнаўца і гісторык Аляксандр Ельскі (1834–1916). "Слова" выдадзена кірылічным шрыфтам, але ў ім яшчэ адчуваецца уплыў лацінкі – у прыватнасці ў выпадку перадачы "ё" як "іо". Выданне складалася з дзвюх частак. Першая – "шчырая праўда" – прадстаўляе гістарычны экскурс аб з'яўленні і распаўсюджванні гарэлкі, палітыцы дзяржаўнай манаполіі і шкоды п'янства. Вось як аўтар, для прыкладу, ацэньвае дзяржаўную палітыку "віннай манаполіі": "былі пакасаваны у сіолах усе корчмы і заведзян так называемы "манаполь" казіонны, с цэлью штоб народ меў менш

можнасці пьянстваваць, дурэць, губіць свае пажыткі, здароўя і душу” [1, с. 4]. Аднак рэформа не спраўдзіла надзей на змяншэнне п’янства, а наадварот: “народ… як толькі уніклі корчмы, стаў піць бязабразна проста на уліцы, пры манаполях, стаў буяніць і гайдамачыць зверска, так, што часта ад таго бываюць крáміналы і калецтвы” [1, с. 5]. Другая частка выдання – “казка” – верш аб жыцці і смерці п’яніцы, дзе п’янства вызначаецца як асноўная прычына занядбанасці гаспадаркі, беднасці і зараняй смерці:

Людзі ў святкі моляцца Бажочку,
А іон сабе з рання з чортам у шыночку.
Яго чорны дзеці, так як галавешкі,
А іон пьецъ гарэлку, да усіо строіць смешкі.
Яго згніла хата і дзіравы стрэхі,
А іон у карчме сядзіць для ўцехі [1, с. 6].

Беларуская каталіцкая газета “Bielarus”, якая выходзіла лацінскім шрыфтам у Вільні ў 1913–1915 гг., у 1913 г. надрукавала некалькі артыкулаў Казіміра Сваяка (Канстанціна Стаповіча) (1890-1926) пад назвай “Alkohol” [14], якія затым былі аб’яднаны ў асобнае выданне. Казімір Сваяк адмаўляў тэзіс аб дапушчальнасці памеранага свaжывання алкаголя і выступае прыхільнікам абсалютнай цвярозасці. Праблему цвярозасці ён разглядае з пункту гледжання як матэрыяльнага дабрабыта: “як цвярозасць і працавітасць ніаднаго беднага даводзяць да дабрабыту, так п’янства і гультайства нават багацейшым дае жабрачы кій у рукі” [14, № 25, с. 2]; так і асновы выратавання душы і цела. Алкаголь адрывае чалавека ад царквы і скарачае яго зямны жыццёвы шлях: “чалавек робіць сабе з алкаголя нейкае божышча і складае яму на ахвяру дабро сваёй сям’і, сваю добрую славу ў людзей і спакой сваёй душы” [14, № 26, с. 2]. Казімір Сваяк знаёміць чытачоў з дзейнасцю літоўскай каталіцкай арганізацыі “Blaivybe” (Цвярозасць), суполкі якой існавалі ў Ковенскай і Віленскай губернях, заклікае паспрабаваць цалкам адмовіцца ад алкаголя спачатку на пэўны перыяд, быць самім прыкладам цвярозага жыцця і шырыць асвету ў грамадстве.

У якасці прыклада польскага выдання на антыалкагольную тэму разгледзім кнігу Антонія Пулаўскага (1856–1932) “Pogadanka o piciu trunkow i pianstwie” [13]. Галоўнай зброяй супраць п’янства аўтар лічыць рэгілію і асвету, але вырашэнне праблемы ён не звязвае з неабходнасцю поўнага адмаўлення ад алкаголя. Вось якія парады ён дае:

– Ніколі не піць штодзённа, каб не прызвычаіцца
– Лепш піць піва, а хто можа – лёгкае, але чыстае віно, а не гарэлку
– Піць належыць пад час яды, ці пасля яды…, бо гарэлка на пусты страўнік больш шкодная. Той звычай распаўсюджаны сярод гарадскіх рабочых (муляроў, цесляроў, фабрычных і інш.), якія закусваюць гарэлку кавалкамі сала, ці гурком. Найгоршы звычай! Трэба спачатку выпіць штосці цёплае – гарбаты, малака, баршчу, ці нечага падобнага. Было б добра, калі б паблізу фабрык знаходзіліся чайныя, працуючыя ўвесь час.
– Не даваць гарэлкі малым дзецям і падлеткам, каб не прызвычаіць іх
– Не лячыць кожную хваробу гарэлкай, як гэта практыкуецца на вёсцы [13, с. 25-26].

Другая частка выдання (без нумерацыи старонак) утрымлівае скарочаны варыянт рамана Даніэля Дэфо “Рабінзон Круза” на польскай мове, што рабіла кнігу больш прывабнай для шырокага кола чытачоў.

Разнастайную інфармацыю па праблеме цвярозасці можна знайсці на старонках перыядычных выданняў – газет і часопісаў. Перыёдыка публікавала ўрадавыя пастановы, хроніку здарэнняў і паведамленні мясцовых карэспандэнтаў. На старонках “Нашай Нівы” адлюстраваліся норавы жыхароў Капыля ў паведамленнях Цішкі Гартнага: “2–3 гады таму сталыя людзі збяруцца, бывала, дзе-небудзь на вуліцы, сядзяць у радок на прызьбе, ды усё гутараць. Гарэлкі, сваркі, бойкі і другіх нялюдскіх спраў тутыка саўсім не зналі. А цяпер? Божа, гаварыць брыдка, ня тое што пісаць! Карчма зваявала кніжку, карты – газету. Як толькі хто мае свабодны час, зараз карчма, карты. Цягаюцца п’яныя па вуліцах і ў дзень і ў ночы. Развялося у нас неякіх корчмаў і шынкоў без ліку. П’юць старыя і маладыя. У свята усё мястэчка Капыль робіцца адным вялікім шынком” [7, с. 3]. Адпаведную хроніку Здзітава (зараз Бярозаўскі раён) стварыў Стары дзед Міхась [8, с. 2].

Своеасаблівымі крыніцамі з’яўляўцца і мастацкія творы таго часу. Народнае апавяданне “Гарэлка” у апрацоўцы Сяргея Палуяна (1890–1910) адлюстроўвае паблажлівае стаўленне да

праблемы п’янства. Невядомы паніч (чорт) пазычыў мужыку грошы і сказаў, што той можа іх не аддаваць, калі заб’е чалавека, зманіць дзяўчыну ці нап’ецца гарэлкі. Жонка мужыка адказала, што “чалавека забіць – страшэнны грэх, дзеўку зманіць – грэх і сорам перад суседзямі, гарэлкі напіцца – глупства”, і сама дала яму грошы на гарэлку. Скончылася гісторыя трагічна – гарэлка, якая сама не лічылася грахом, стала пачаткам усіх астатніх [10].

Папячыцельствы аб народнай цвярозасці, як установы, якія павінны былі шырыць ідэі цвярозасці (у выглядзе памеранага спажывання алкаголя) сярод насельніцтва штогод рабілі справаздачы Міністэрству фінансаў аб сваёй дзейнасці. Гэтыя справаздачы маглі выходзіць асобнымі выданнямі, як, на прыклад, справаздачы Магілёўскага губернскага папячыцельства. У фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі захоўваюцца матэрыялы за 1899–1903 гг. [9]. Больш інфарматыўнымі з’яўляюцца агляды справаздач усіх камітэтаў, адзін з першых – “Попечительства о народной трезвости в 1901 г.” – быў створаны Дз.А. Тушынскім [12]. Дз. Булгакоўскі аб’яднаў інфармацыю аб папячыцельствах за перыяд 1895–1909 гг. [3]. Гэтыя выданні дазваляюць прасачыць асноўныя накірункі дзейнасці папячыцельстваў, іх асабовы і сацыяльны склад, выявіць дынаміку змянення колькасці членаў арганізацый, створаных імі ўстаноў – чайных, бібліятэк, народных дамоў; іх мерапрыемствах – чытаннях, гуляннях, святах і г.д. Маштабны матэрыял дазваляе таксама выявіць мясцовыя асаблівасці, адзначыць тыя галіны дзейнасці ў якіх губернскія папячыцельства дасягнулі найбольшых поспехаў. Так, Мінская губерня па колькасці арганізацыі народных хароў займала другое месца па ўсёй Расійскай Імперыі, а Магілёўская – адно з першых па колькасці чайных [12, с. 17, 19].

Адзначаныя крыніцы адлюстроўваюць не толькі накірункі дзяржаўнай палітыкі, але і стаўленне да праблемы цвярозасці шырокіх слаёў грамадства, норавы насельніцтва і магчымыя шляхі выкаранення п’янства, і з’яўляюцца важным элементам па вывучэнню гісторыі паўсядзённасці і грамадскай думкі пачатку XX ст.


1. А.I. Слова аб праклятай гарэлцы і аб жыцці і смерці п’яніцы. – Пецярбург, 1900. – 12 с.
2. Бруновский, В.Х. Согласие против пьянства и агрономическая помощь сельскому населению Минской губернии / В.Х. Бруновский. – Минск : Электротипография С. А. Некрасова, 1914. – 8 с.
3. Булгаковский, Д.Г. Очерк деятельности попечительств а народной трезвости за всё время их существования (1895–1909) / Д.Г. Булгаковский. – СПб., 1910. – 180 с.
4. Митрофан, Беседа о вреде алкоголя и средствах борьбы с ним / епископ Митрофан. – Минск : Электротипография С.А. Некрасова, 1912. – 48 с.
5. Митрофан, В борьбе за трезвость / епископ Митрофан. – Минск : Мин. Православ. Свято-Николаев. нар. Братство, 1913 – 190 с.
6. Мяньчэня, С.В. Антыалкагольныя падручнікі ў Расійскай Імперыі пачатку XX ст. / С.В. Мяньчэня // Романовские чтения IX : сб. статей Международной науч. конференции / под общ. ред. Н. М. Пурышевой. – Могилёв : МГУ им. А. А. Кулешова, 2013. – С. 107–109.
7. Наша Ніва. – 1908. – № 25 – 4 снежня.
8. Наша Ніва. – 1913. – № 23 – 7 чэрвеня.
9. Отчёт Могилёвского попечительства о народной трезвости за 1899 год. – Могилёв, 1900. – 79 с.
10. Палуян, С. Гарэлка / С. Палуян // Наша Ніва. – 1910. – № 3 – 14 студзеня. – С. 3.
11. Речи М.Д. Челышева, произнесённые в Третей Государственной Думе о необходимости борьбы с пьянством и по другим вопросам. – СПб., 1912. – 796 с.
12. Тушинский, Д.А. Попечительства о народной трезвости в 1901 г. / сост. Д.А. Тушинский. – СПб., 1904. – 34, 45, 31 с.
13. Pulawski, Antoni Arkadiusz. Pogadanka o piciu trunkow i pianstwie / A. Pulawski. – Wydanie 2-e, znacznie poprawione. – Warszawa: Sklad glowny w Ksiegarni polskiej, 1912. – 28 с.
14. Swajak, Kazimir. Alkohol / K. Swajak. // Bielarus. – 1913. – № 24 – 5 верасня. – С. 1–2; № 25 – 12 верасня. – С.1–2; № 26 – 19 верасня. – С. 1–2.



**Чэн Юаньцзи**


## ИСТОЧНИКИ ПО ИСТОРИИ ЦЕРКОВНО-ПРИХОДСКИХ ШКОЛ ВО ВТОРОЙ ПОЛОВИНЕ XIX – НАЧАЛЕ XX ВЕКА (по материалам Виленского учебного округа)

Изучение истории церковно-приходских школ – одно из направлений в изучении истории православной церкви. Цель статьи – раскрыть деятельность церковно-приходских школ Белорусско-Литовских епархий: Литовской, Минской, Могилёвской и Полоцкой; а также созданной в 1900 г. из части Литовской православной епархии Гродненской православной епархии. Титул правящего архиерея – «епископ Гродненский и Брестский» [1] во второй половине XIX – начале XX века, выявить специфику их деятельности, место и роль в жизни православного белорусского населения.

Источниковую базу исследования составили материалы Национального исторического архива Беларуси и Национального исторического архива Беларуси в г. Гродно, Российского госу-